Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

28 САКАВІКА 2007 г. СЕРАДА

№ 58 (25923)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

**СЁННЯ ВЫ ЯШЧЭ МОЖАЦЕ ПАДПІСАЦЦА НА «ЗВЯЗДУ». СПЯШАЙЦЕСЯ!**

**ДА ПАБАЧЭННЯ. У ВАС ДОМА!**

Разам з карткай на розыгрыш прыйшло пісьмо з Бабруйска. «Яшчэ да развалу Саюза, — піша сп. Панцялейка — я выйграў гамак, потым у абласной латарэі — кухонны камбайн. Па яго давялося ехаць аж у Магілёў... У звяздоўскай жа гульні — грошай за латарэю плаціць не трэба, выйграш табе прывязуць... Я не вар'ят, каб прапусціць такое! А што — два разы радасць была, дык можа будзе і ў трэці?.. Таму — да пабачэння. У мяне дома. У момант уручэння галоўнага прыза».

Што ж, спадзявацца, кажуць, не шкодна: некаму ў звяздоўскай латарэі абавязкова пашанцуе.

Каму? Не ведае ніхто. Але ж факт: выйграе той (у тым ліку і нешта з прызоў), хто падпісаўся на «Звязду», той, хто запоўніў і даслаў у рэдакцыю картку, той, да каго і ў **новым квартале будзе прыходзіць старэйшая і (са штодзённых) адзіная беларускамоўная газета «Звязда», НА ЯКУЮ СЁННЯ ЯШЧЭ МОЖНА АФОРМІЦЬ ПАДПІСКУ.**

## У МІНСКУ Ў ЛЮТЫМ СЯРЭДНІ ПАМЕР МЕСЯЧНАЙ ПЕНСІІ СКЛАЎ BR300,1 ТЫС.

**У Мінску ў лютым гэтага года сярэдні памер прызначанай месячнай пенсіі склаў Br300,1 тыс., або 127,7 працэнта да велічыні сярэднядушавага мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і пенсіянераў. Аб гэтым паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні статыстыкі.**

Сярэдні памер пенсіі па ўзросту склаў Br312,9 тыс., па інваліднасці — Br272,7 тыс., з выпадку страты карміцеля — Br178 тыс., сацыяльнай пенсіі — Br113,5 тыс. Рэальны памер назначанай месячнай пенсіі (пенсіі, скарэкціраванай на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у лютым 2007 года ў параўнанні з лютым 2006 года павялічыўся на 12,2 працэнта, у параўнанні са студзенем 2007 — знізіўся на 0,6 працэнта.

**Кар. БЕЛТА.**

## А. Лукашэнка ў сувязі са смерцю народнага артыста СССР М. Ульянава накіраваў спачуванне яго жонцы і дачцэ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі са смерцю мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Вахтангава, Героя Сацыялістычнай Працы, народнага артыста СССР Міхаіла Ульянава накіраваў спачуванне яго жонцы Алe Парфаньяк і дачцэ Алене Ульянавай.**

«Творчасць Міхаіла Аляксандравіча карыстаецца вялікім прызнаннем у нашай краіне. Мы заўсёды будзем помніць і любіць яго як вялікага акцёра і рэжысёра, чыё мастацтва садзейнічала ўмацаванню дружбы, супрацоўніцтва і культурных сувязяў паміж народамі Беларусі і Расіі», — адзначаецца ў спачуванні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## АЛІМПІЙСКАЯ ЗОРКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Чацвёрты год запар Вераніка СТАШУЛЁНАК удзельнічае ў рэспубліканскіх алімпіядах па беларускай мове. Тройчы вучаніца Полацкай школы-інтэрната для адораных дзяцей займала першыя месцы. Гэтымі днямі яна зноў у складзе каманды Віцебскай вобласці ў Мазыры змагаецца за прызавое месца.**

**Вераніка — старэйшая дачка ў сям'і працоўных з Міёраў, у якую шмат гадоў прыходзіць наша газета.**

**— Я вырасла са «Звяздою», — кажа Вераніка Сташулёнак.**

**За выдатныя поспехі і дасягненні ў вучобе партрэт адзінаццацікласніцы змешчаны на гарадской «Дошцы гонару», дзе і быў зроблены гэты фотаздымак.**

## На беларуска-расійскай мяжы чэргі зменшацца?

**Да 15 мая павінен быць адменены грашовы збор за афармленне фізічнымі асобамі пасведчання аб часовым увозе на тэрыторыю Расіі аўтатранспартных сродкаў з тэрыторыі Беларусі. Аб гэтым ўчора паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню яднання народаў Расіі і Беларусі, які будзе адзначацца 2 красавіка.**

Паводле слоў намесніка Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Васіля Хрола, палажэнне аб адмене збору ўтрымліваецца ў падпісаным 23 сакавіка Пагадненні аб мерах па развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй. У выніку адмены збору, на думку Васіля Хрола, час афармлення транспартных сродкаў на беларуска-расійскай мяжы будзе скарочаны прыкладна на 30 працэнтаў. Гэта павінна зменшыць чэргі на мяжы паміж дзвюма краінамі.

Намеснік Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы патлумачыў таксама, што расійскі бок «не ад добрага жыцця ўвёў пасведчанне ўвозу транспартных сродкаў». Гэта было зроблена для таго, каб прадухіліць «чорныя» схемы ўвозу ў Расію аўтамабіляў. З-за таго, што ў Расіі існуюць больш высокія, чым у Беларусі, пошліны на ўвоз транспартных сродкаў, зробленых у трэціх краінах, «шэраг грамадзян набывалі аўтамабілі на «падстаўных» грамадзян у Беларусі, атрымлівалі даверанасці, прыязджалі ў Расію на такіх аўтамабілях і там ездзілі».

Аляксандр Сурыкаў дадаў таксама, што згаданае вышэй Пагадненне вядзе да ўніфікацыі мытных пошлін у дзвюх краінах у будучым. Пры гэтым ён не змог адказаць, ці будуць пошліны паднятыя ў Беларусі, ці яны будуць зніжаныя ў Расіі.

На думку Аляксандра Сурыкава, Саюз Беларусі і Расіі з'яўляецца сёння «найбольш прасунутым інтэграцыйным аб'яднаннем на постсавецкай прасторы». Пры гэтым многія элементы Саюзнай дзяржавы, паводле яго слоў, могуць быць выкарыстаны ў інтэграцыйных працэсах, у прыватнасці, краін — удзельніц СНД.

У той жа час «існуюць пытанні юрыдычнага афармлення Саюзнай дзяржавы». Гаворка ідзе пра прыняцце Канстытуцыйнага акта. «Дэфакта вялікая колькасць прымет Саюзнай дзяржавы існуе, але юрыдычнага дакумента, які афармляе гэтую арганізацыйную структуру, няма. На жаль».

Васіль Хрол, у сваю чаргу, заявіў, што прыняцце Канстытуцыйнага акта з'яўляецца справай часу. «Я па натуры аптыміст. Думаю, што сёлета праект Канстытуцыйнага акта нарэшце разгледзіць Вышэйшы дзяржаўны савет. І дакумент будзе разгледжаны на рэферэндумах у Расіі і Беларусі».

Аляксандр Сурыкаў адзначыў, што знешнепалітычным прыярытэтам Расіі з'яўляецца развіццё адносінаў з краінамі СНД. «Але з безумоўнай пабудовай раўнапраўных рынкавых адносінаў». «Задача Беларусі і Расіі — пабудаваць канкурэнтаздольную вытворчасць. А гэта без рынкавых узаемаадносінаў не будуецца».

Гаворачы пра эканамічныя сувязі з рэгіёнамі Расіі, Васіль Хрол адзначыў, што ў 2006 годзе найбольш актыўныя сувязі Беларусь падтрымлівала з Цюменскай вобласцю (на яе долю прыходзілася каля 32 працэнтаў расійска-беларускага тавараабароту), Масквой (18 працэнтаў), Маскоўскай вобласцю, Санкт-Пецярбургам і Пермскім краем. Васіль Хрол паведаміў таксама журналістам, што ў будучым павінна пачацца ажыццяўленне праекта па вытворчасці расійска-беларускага малагабарытнага самалёта для мясцовых паветраных ліній. «Зараз ужо пабудавана мадэль і праведзены поўны цыкл аэрагідрадынамічных іспытаў. Расійска-беларускі самалёт будзе мець адны з самых лепшых характарыстык у свеце па надзейнасці пры невысокім кошце. Гэтаму праекту мы будзем аказваць актыўную падтрымку».

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

## Нацбанк Беларусі ў 2007 годзе забяспечыць стабільнасць курсу нацыянальнай валюты

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка паставіў перад Нацыянальным банкам задачу забяспечыць у 2007 годзе выкананне ўсіх прагнозных паказчыкаў развіцця банкаўскай сістэмы краіны, у тым ліку і ў першым паўгоддзі. Стан спраў у банкаўскай сферы абмяркоўваўся 27 сакавіка ў ходзе рабочай сустрэчы кіраўніка дзяржавы са старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Пятром Пракаповічам.**

Прэзідэнт праінфармаваны аб тым, як выконваюцца Асноўныя накірункі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі, у прыватнасці, аб выніках работы банкаўскай сістэмы за 2 месяцы гэтага года.

Пётр Пракаповіч далажыў кіраўніку дзяржавы аб тым, што па выніках студзеня—лютага 2007 года забяспечаны стабільны курс нацыянальнай валюты. Беларускі рубель да долара ЗША за гэты перыяд часу дэвальваваўся толькі на 0,1 працэнта, што значна ніжэй прагнозных паказчыкаў. Старшыня праўлення Нацыянальнага банка запэўніў Прэзідэнта, што такая стабільнасць нацыянальнай валюты будзе забяспечана і ў далейшым. Гэта перакананасць грунтуецца на выніках работы эканомікі краіны ў гэтым годзе. У прыватнасці, валютная выручка беларускіх прадпрыемстваў за два месяцы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася на 15 працэнтаў. У студзені—лютым 2007 года Нацыянальны банк Беларусі больш як на 5 працэнтаў нарасціў золатавалютныя рэзервы, а таксама забяспечыў дадатнае сальда ў гандлі валютай у памеры больш як $100 млн.

Пётр Пракаповіч таксама далажыў Аляксандру Лукашэнку аб тым, што банкаўская сістэма поўнасцю задавальняе патрэбнасці эканомікі ў крэдытных рэсурсах. За два месяцы 2007 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2006 года аб'ём крэдытных рэсурсаў, выдадзеных банкамі рэальнаму сектару эканомікі, павялічыўся ў 1,6 раза, аб'ём крэдытавання жылля — у 1,5 раза, спажывецкага крэдытавання — у 2 разы.

Павелічэнню прытоку замежных інвестыцый у эканоміку краіны будзе садзейнічаць атрыманне Беларуссю крэдытнага рэйтынгу краіны. Пётр Пракаповіч лічыць, што наша краіна атрымае такі рэйтынг не менш чым ад 2 рэйтынгавых агенцтваў ужо ў першым паўгоддзі 2007 года.

Рэалізацыя Нацыянальным банкам працэнтнай палітыкі таксама праходзіць у строгай адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2007 год. Працэнтная палітыка накіравана, з аднаго боку, на задавальненне патрэбнасцяў насельніцтва і прадпрыемстваў у крэдытах, з другога — на стымуляванне прытоку ўкладаў юрыдычных і фізічных асобаў у банках. Па стану на 15 сакавіка 2007 года дэпазіты насельніцтва павялічыліся з пачатку года на Br410 млрд.

Нацыянальны банк з 1 лютага часова павысіў стаўку рэфінансавання на 1 працэнтны пункт — да 11 працэнтаў гадавых. Як адзначыў Пётр Пракаповіч, гэта дазволіла павялічыць стаўку па прыцягнутых дэпазітах насельніцтва. У прыватнасці, за люты сярэдняя стаўка па такіх укладах склала 12,2 працэнта гадавых, што на 2,5 працэнтнага пункта вышэй, чым у снежні 2006 года. Нацыянальны банк, паводле слоў яго кіраўніка, паступова, па меры зніжэння інфляцыі, будзе зніжаць стаўку рэфінансавання з тым, каб па выніках 2007 года выйсці на прагнозныя паказчыкі па яе значэнню.

Плацежная сістэма Беларусі ў студзені—лютым таксама працавала стабільна. Штодзённа з пачатку года беларускія банкі праводзяць плацяжы на суму каля 2,2 трлн рублёў. Па выніках сённяшняга даклада Прэзідэнт падкрэсліў: набраныя тэмпы развіцця банкаўскага сектара павінны быць абавязкова вытрыманы.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Крымінал

## ГАЛАЎНЫ БОЛЬ НА 384 МЛН

**У Мінскім раёне ў вёсцы Шчамысліца супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю УУС і АБЭЗ Мінскага РУУС у двары дома пенсіянеркі ў складскім памяшканні былі знойдзены 480 металічных дзвярэй, якія належаць 36-гадоваму індывідуальнаму прадпрымальніку.**

Высветлілася, што захоўваўся тавар без дакументаў, якія б пацвярджалі законнасць іх набыцця, увозу і рэалізацыі. Па гэтаму факту праводзіцца далейшая праверка.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ПАДПОЛЬНЫ СКЛАД

У доме жыхаркі Брэста супрацоўнікамі фінансавай міліцыі знойдзена амаль 2 тысячы бутэлек розных алкагольных напояў і 4 тоны тэхнічнай спіртазмяшчальнай вадкасці. Прадукцыя коштам 31 мільён рублёў не мела акцызных марак, і яе канфіскавалі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Годовой баланс ЗАСО «ТАСК» за 2006 год

220005 г. Минск, пр. Независимости, 58/9, т/ф: 296-68-35, 292-47-76, 296-64-74

*тыс. руб.*

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| Основные средства | 3 866 748,80 | Источники собственных средств, всего | 6 428 269,00 |
| Нематериальные активы | 14 078,90 | в том числе уставный фонд | 1 411 875,00 |
| Финансовые вложения, всего в том числе: | 187 511,70 | резервный фонд | 211 781,30 |
| | | добавочный фонд | 2 391 848,10 |
| инвестиции в другие организации | | фонд накопления | 1 276 975,40 |
| облигации и другие обязательст. | 12 537,30 | фонд потребления | - |
| прочие финансовые вложения | 171 974,40 | целевое финансирование | - |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 1 200 291,40 | Нераспределенная прибыль | 1 070 017,40 |
| Дебиторы, всего | 1 143 869,60 | Нераспределенная прибыль отчетного года | 65 771,80 |
| Дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 41 355,50 | Страховые резервы и фонды в том числе: | 15 077 176,00 |
| | | страховые резервы | 14 787 067,00 |
| Депо премий по рискам, принятым в перестрахование | - | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 246 019,40 |
| Дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 1 102 514,10 | гарантийные фонды | 44 089,60 |
| | | Кредиторы, всего | 1 541 072,80 |
| Прочие активы | | Кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 238 978,40 |
| Незавершенное строительство | 922 489,90 | | |
| Материальные ценности и затраты | 1 538 596,00 | Кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 1 302 094,40 |
| Денежные средства | 14 491 368,80 | | |
| Собственные акции, выкупленные | - | | |
| Прочие активы | 5 674,90 | Депо премий по рискам, переданным в перестрахование | - |
| Непокрытые убытки прошлых лет | - | Заемные средства | - |
| Непокрытые убытки отчетного года | - | Прочие пассивы | 324 112,20 |
| БАЛАНС | 23 370 630,00 | БАЛАНС | 23 370 630,00 |

## Отчет о финансовых результатах ЗАСО «ТАСК» за 2006 год

*тыс. руб.*

| Наименование показателя | За отчетный период |
|---|---|
| **I. Страхование жизни** | |
| Страховые взносы (премии) | - |
| Страховые выплаты | - |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -) | - |
| Расходы на ведение дела, связанные с заключением договоров страхования жизни | - |
| **Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)** | - |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** | |
| Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование | 34 935 605,30 |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -) | - 1 477 456,70 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты), всего в том числе: | 17 436 340,80 |
| доля перестраховщиков | 435 369,90 |
| Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -) | - 1 199 925,40 |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | |
| Отчисления в фонд (резерв) предупредительных мероприятий | 2 769 974,40 |
| Расходы на ведение дела, связанные с заключением договоров страхования иным, чем страхование жизни | 10 479 721,60 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 228 285,30 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 142 419,70 |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)** | 2 093 421,90 |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II** | |
| Операционные доходы | 3 301 678,70 |
| Операционные расходы | 2 517 958,90 |
| Внереализационные доходы | 800 803,20 |
| Внереализационные расходы | 529 843,20 |
| Доходы (убыток) от реализации прочих активов | |
| Финансовый результат | 3 148 101,70 |
| **Использовано прибыли** | 3 082 329,90 |
| Нераспределенная прибыль (убыток) отчетного периода (+ или -) | 65 771,80 |

**Общество с дополнительной ответственностью «ГлобалАудит»**
УНП 190654732, 220002 г. Минск, ул. Сторожевская, 15-325, тел. (017) 209-73-25
Р/с 3012104420008 в ОАО «Технобанк», г. Минск, код 182

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ

*23 февраля 2007 г.* *г. Минск*

**Адресат:** Генеральному директору ЗАСО «ТАСК» Волкову Игорю Ивановичу.

**Аудируемое лицо:** Закрытое акционерное страховое общество «ТАСК»;

**местонахождение:** г. Минск, проспект Независимости, д. 58;

**сведения о государственной регистрации:** решение Комстрахнадзора Республики Беларусь от 07.09.2001 г., УНП 100003006.

**Аудиторская организация:** Общество с дополнительной ответственностью «ГлобалАудит»;

**местонахождение:** 220002 г. Минск, ул. Сторожевская, 15-325, телефон 209-73-25;

**сведения о государственной регистрации:** свидетельство Минского горисполкома от 27.09.2005 г. о государственной регистрации в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190654732, УНП 190654732.

Лицензия на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0061697 от 14.11.2005 г. выдана Министерством финансов Республики Беларусь. Срок действия лицензии по 13.11.2010 г.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ЗАСО «ТАСК» за 2006 г. Бухгалтерская отчетность ЗАСО «ТАСК» состоит из:

*бухгалтерского баланса;*

*отчета о прибылях и убытках;*

*приложений, предусмотренных нормативными правовыми актами;*

*пояснительной записки.*

Ответственность за подготовку и представление названной бухгалтерской отчетности несет руководство ЗАСО «ТАСК». Наша обязанность заключается в том, чтобы на основании проведенного аудита выразить мнение о достоверности данной отчетности во всех существенных отношениях и соответствии порядка ведения бухгалтерского учета законодательству Республики Беларусь.

Мы провели аудит в соответствии с:

*Законом Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности»;*

*республиканскими правилами аудиторской деятельности;*

*правилами аудиторской деятельности аудиторской организации;*

*нормативными правовыми актами, регулирующими отдельные виды деятельности аудируемого лица.*

Аудит планировался и проводился таким образом, чтобы получить достаточную уверенность в том, что бухгалтерская отчетность не содержит существенных искажений. Аудит проводился на выборочной основе и включал в себя изучение доказательств, подтверждающих значение и раскрытие в бухгалтерской отчетности информации о финансово-хозяйственной деятельности ЗАСО «ТАСК», оценку принципов и методов бухгалтерского учета, порядка подготовки бухгалтерской отчетности, определение и анализ существенных оценочных значений, применяемых ЗАСО «ТАСК».

Мы полагаем, что проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской отчетности ЗАСО «ТАСК» и соответствии совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь.

По нашему мнению, бухгалтерская отчетность ЗАСО «ТАСК» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2007 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2006 г.

**Директор ОДО «ГлобалАудит»** **С.А. МАТЮШОНОК**

**Аудитор** **В.А. МАТЮШОНОК**

Ва ўрадзе

## ІНВЕСТЫЦЫІ ПА МАКСІМУМУ

**У гэтым годзе, як і на перспектыву, на мадэрнізацыю вытворчасцяў у рэспубліцы неабходна павялічваць аб'ём прыцягнутых інвестыцый: толькі ў такім выпадку беларускія прадпрыемствы будуць канкурэнтаздольнымі. «Калі мы не будзем ставіць перад сабой амбіцыйныя задачы па максімальнаму прыцягненню інвестыцый на тэхнічнае пераўзбраенне нашых прадпрыемстваў, а заспакоімся, то і ніякіх вынікаў у такім выпадку не будзе», — заявіў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім абмяркоўваўся праект пастановы аб інвестыцыйнай дзейнасці ў 2007 годзе, кіраўнік урада Сяргей Сідорскі.**

І сапраўды, сёлета міністэрствам і канцэрнам давядзецца прыкласці істотныя намаганні, каб выканаць прадугледжанае дакументам заданне. Плануецца, што тэмп росту інвестыцый у асноўны капітал у гэтым годзе павінен скласці 114,5—117 працэнтаў, у грашовым выражэнні аб'ём інвестыцый складзе 24 трыльёны рублёў. Паводле слоў міністра эканомікі Мікалая Зайчанкі, аб'ём доўгатэрміновых крэдытаў у рэальны сектар эканомікі прадугледжваецца ў суме 3 трыльёны рублёў. Камерцыйным банкам пастаўлена задача па крэдытаванню рэальнага сектара эканомікі за кошт замежных рэсурсаў у памеры 1,3 мільярда долараў. Прыцягненне замежных крэдытаў, пазык і прамых інвестыцый для фінансавання інвестыцыйных праектаў, уключаючы набыццё імпартнага абсталявання, павінны скласці крыху больш за 4 трыльёны рублёў, або 1,9 мільярда долараў — гэта 17 працэнтаў ад агульнага аб'ёму інвестыцый у эканоміку. Прычым апошняе заданне, як зазначыў Мікалай Зайчанка, павялічана больш як у два разы. У графік падрыхтоўкі інвестыцыйных праектаў у гэтым годзе, які быў прадстаўлены на пасяджэнні, уключаны 183 праекты на суму 1,26 мільярда долараў.

На ўчарашнім пасяджэнні міністр эканомікі агучыў таксама комплексны план па прыцягненню замежных інвестыцый у эканоміку краіны. Дакумент, падкрэсліў Мікалай Зайчанка, утрымлівае шэраг эканамічных напрамкаў, якія накіраваны на актывізацыю прыцягнення інвестыцый з-за межаў рэспублікі. У ліку найбольш важных ён назваў распрацоўку праекта Указа Прэзідэнта Беларусі аб вызваленні ад падатку на дабаўленую вартасць і мытных плацяжоў тэхналагічнага абсталявання, камплектуючых і запчастак да яго, што ўвозяцца на тэрыторыю нашай краіны ў якасці ўкладаў у статутны фонд, а таксама праект Указа аб мерах па прыцягненню замежных крэдытных рэсурсаў на прыкладзе кітайскай крэдытнай лініі. «Мы маем намер стварыць больш стымулюючыя ўмовы ў частцы як змяншэння працэнтаў, так і вызвалення ад выплаты ўвазных мытных пошлін, а таксама правядзення працэдуры закупак без тэндара», — паведаміў Мікалай Зайчанка. Прапануецца ўнесці карэктывы і ў праект праграмы развіцця свабодных эканамічных зон. У пераліку найбольш важных мерапрыемстваў, на думку міністра, знаходзіцца падрыхтаваны праект Указа аб канфіскацыі зямельных участкаў для размяшчэння аб'ектаў інвестыцыйнай дзейнасці. «У рамках плана прадугледжаны таксама пералік мерапрыемстваў па ўдасканаленню кіравання дзяржмаёмасцю, далейшае спрашчэнне ў галіне бюджэтна-падатковай палітыкі», — зазначыў Мікалай Зайчанка.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## У МІНСКУ ПА ВУЛІЦЫ ЖЫЛУНОВІЧА ДА 30 ЧЭРВЕНЯ БУДЗЕ ЗАКРЫТЫ РУХ

У сувязі з рэканструкцыяй цеплатрасы па вуліцы Жылуновіча ў Мінску, на ўчастку ад Партызанскага праспекта да вуліцы Бехцерава, да 30 чэрвеня будзе закрыты рух усіх транспартных сродкаў за выключэннем грамадскага транспарту. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведамілі ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама. Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе вадзіцелям улічваць гэтыя абставіны і выключыць з маршруту руху названы ўчастак вулічна-дарожнай сеткі.

## 100 ДОЛАРАЎ ЗА ТЭХАГЛЯД

**Інспектар перасовачнай дыягнастычнай станцыі РУП «Белтэхагляд» і непрацуючы жыхар горада Беразіно пагадзіліся паспрыяць мінчаніну ў праходжанні тэхнічнага агляду.**

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, за свае паслугі «дабрадзеі» ўзялі хабар у памеры 100 долараў. Аднак патраціць «брудныя» грошы не паспелі — былі затрыманы супрацоўнікамі міліцыі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## «ЗАНАЧКА»...

43-гадовая жыхарка Гродна, у чым падвале дома па вуліцы Сыракомлі супрацоўнікі Ленінскага РАУС выявілі склад «левых» цыгарэт, выказала даволі арыгінальную версію іх з'яўлення: маўляў, яна шмат курыць. Гэтая «заначка» ўяўляла сабой прыкладна ... 13 тысяч пачкаў цыгарэт «Норд-Стар» і «ЕВ» на агульную суму больш за 16 мільёнаў рублёў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

проводит открытый аукцион по продаже части (53/100 доли) двухэтажного кирпичного здания с двумя входами общей площадью 185,6 кв.м, расположенного в г. Копыль по ул. Партизанская д. 5. Площадь земельного участка 0,0736 га. Начальная цена — 137 500 000 бел. руб. с НДС. Объект продается с условием запрета использования данного здания в области оказания ритуальных услуг. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.01.2007 г. Аукцион состоится 05.04.2007 г. в 15.00 по адресу: г. Копыль, площадь Ленина, д.1. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.04.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 322.

**КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН (8-017) 224-61-34.**

**НАШ САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

проводит открытый аукцион по продаже в **г. Бресте, ул. Красногвардейская, 129:** здание арматурного цеха с кранбалкой (об. пл. 427,0 кв.м). Нач. цена 290 000 000 бел. руб. с НДС. **В г. Гомель, пер. Строителей, 3:** здание РБУ с наклонной галерееей, емкостями для цемента, двумя бетоносмесителями и здание компрессорной, площадкой козлового крана, козловым краном (об. пл. 563 кв.м). Нач. цена 280 000 000 бел. руб. с НДС. Здание арматурного цеха с двумя мостовыми кранами, (об. пл. 2125 кв.м). Нач.цена 354 000 000 бел. руб с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.03.2007 г. Аукцион состоится 12 апреля 2007 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11 апреля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

**ТЕЛЕФОНЫ: (8-017) 224-61-34, 234-56-23, 237-80-02.**

**САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

проводит открытый аукцион по продаже обращенной в доход государства незавершенной строительством производственной базы (Борисовский р-н, д. Углы), в том числе: АБК, ремонтная мастерская, подстанция, котельная, нефтебаза, бензозаправочный пункт, канализация, ж/б забор. Площадь зем. участка — 5,3054 га. Начальная цена снижена на 20% и составляет — 679 276 160 бел. руб. Задаток в сумме 50 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней. Объект продается без условий. Аукцион состоится 11.04.2007 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 10.04.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

**КОНТАКТНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ: (8017) 224-61-34, (80177) 73-46-63.**

**САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY**

ISSN 1990-763X

9 771990 763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.03.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 143,00 |
| 1 еўра | 2 860,91 |
| 1 латвійскі лат | 4030,09 |
| 1 літоўскі літ | 828,58 |
| 1 чэшская крона | 102,15 |
| 1 польскі злоты | 738,93 |
| 1 расійскі рубель | 82,37 |
| 1 украінская грыўня | 426,04 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 26,0180 |
| 10 UAH | 51,3895 |
| 1000 BYR | 12,1176 |
| EUR | 34,6768 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 27.03.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2140 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

## Падпіска-2007
# «ЗВЯЗДА» ЦІ «ЗОРКА?»

**Мяне зацікавіла, чаму ваша газета называецца менавіта «Звязда»? А не «Зорка»... Ёсць, мусіць, нейкае гістарычнае тлумачэнне?**

**Марына БУЙНОЎСКАЯ,**
*г. Мінск*

Адказ на пытанне маладой (мяркуючы па лісту) чытачкі мы пашукалі ў старых календарах. Пра дзень 7 студзеня яны пісалі: «Каляды — першае зімовае свята беларусаў і іншых народаў у гадавым крузе старажытнай земляробчай абраднасці. Калядавалі каля двух тыдняў. Звездары насілі па вуліцы звязду — сімвал сонца, моладзь з пераапранутымі ў «казу», «мядзведзя», «жорава» аднавяскоўцамі хадзіла па хатах. Віншавалі гаспадароў, спявалі жартоўныя песні, частаваліся. Наладжвалі варажбу, розныя забавы і гульні ў «Яшчара», «Жаніцьбу Цярэшкі» і інш. Калядны рытуал даўней меў магічны сэнс, быў цесна звязаны з жыццём прыроды, яе чакаемым абуджэннем...»

Дарэчы, у календары «Нашай нівы» за 1913 год пазначана: «Кожны свядомы беларус павінен глядзець за агульным грамадскім дабром».

І яшчэ (не менш актуальнае!): «Кожны свядомы беларус павінен у гэтым годзе парупіцца знайсці двух падпісчыкаў на беларускія газеты».

А калі і трох... Калі не толькі ў гэтым...

Заставайцеся з намі!

## Пекінская «капуста»
# СЁЛЕТА ГАЛОЎНАЕ — ЗДАБЫЦЬ ЛІЦЭНЗІІ

**ДА ЛЕТНЯЙ XXIX АЛІМПІЯДЫ ЗАСТАЛОСЯ 500 ДЗЁН**

**Вільготнасць 95 працэнтаў, сярэдняя тэмпература 30—35 градусаў спякоты, загазаваны мегаполіс — такімі абмаляваў умовы, з якімі сутыкнуцца беларускія спартсмены ў Пекіне, Дзмітрый Шычко, намеснік міністра спорту і турызму Беларусі. Каб нашы атлеты без праблем справіліся з акліматызацыяй, кожная нацыянальная каманда атрымала спецыяльныя рэкамендацыі ад вучоных і медыкаў, якія выязджалі ў Кітай для правядзення даследаванняў.**

— Канешне, у такіх кліматычных умовах лягчэй будуць адчуваць сябе мясцовыя спартсмены і прадстаўнікі суседніх дзяржаў, — заўважыў Дзмітрый Якаўлевіч. — І ўсё ж канкурэнцыя за медалі абвострыцца паміж пяцёркай сусветных лідараў — Кітаем, ЗША, Расіяй, Германіяй, Аўстраліяй. Аднак, без сумнення, умяшаюцца ў барацьбу за медалі Францыя, Італія, Паўднёвая Карэя, Англія, Куба. Паводле слоў Георгія Катуліна, генеральнага сакратара Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі, Алімпіяда пачнецца 8 жніўня 2008 года, на ёй будзе разыграна 302 камплекты ўзнагарод у 25 відах спорту.

Падрыхтоўка беларускіх спартсменаў да Гульняў у Кітаі пачалася пасля Алімпіяды ў Афінах. Яна падзелена на пяць этапаў: 1. У 2005 годзе былі вызначаны прыярытэтныя віды спорту і праведзена селекцыя атлетаў (адабрана 302 спартсмены ў 25 відах спорту); 2. Летась акцэнтавалі ўвагу на фізічнай, псіхалагічнай і тэхніка-тактычнай падрыхтоўцы, а колькасць прэтэндэнтаў на ўдзел у Гульнях скарацілі да 159 спартсменаў у 23 відах спорту (так званая група «А»); 3. Сёлета, у базавы год, спартсмены павінны здабыць ліцэнзіі для ўдзелу ў Алімпіядзе, а прадстаўнікі міністэрства спорту ствараюць усе патрэбныя для гэтага ўмовы; 4. Са студзеня па май 2008 года будзе канчаткова сфарміраваны састаў нацыянальнай зборнай; 5. Чэрвень—жнівень 2008 года — стварэнне аптымальных умоў, каб беларускія спартсмены не згубілі свой патэнцыял.

Беларусь выхавала 60 алімпійскіх чэмпіёнаў. Задача нашых спартсменаў у Пекіне — вайсці ў дваццатку мацнейшых і сабраць не меншы «ўраджай», чым у 2000 годзе ў Сіднеі — 17 узнагарод.

**Ірына ПРЫМАК.**

## Адраджэнне вёскі
# СІЛА ЗЯМЛІ,
## ці Як іншаземцу зарабіць грошы ў Беларусі

**Калі ад нас едуць на заробкі за мяжу, то гэта нікога не здзіўляе. З'ява натуральная для ўсяго свету — людзі хочуць зарабіць грошы ў больш багатай краіне і вярнуцца дамоў. Але нямала фактаў, калі прыязджаюць і ў Беларусь з далёкага замежжа, каб рабіць тут свой бізнэс і займаюць, здавалася б, самую праблемную нішу — укладваюць грошы ў сельскую гаспадарку. І не памыляюцца.**



Эміл Енеў усё жыццё пражыў у Балгарыі, там нарадзіўся, вырас, жаніўся. Невядома, як бы склаўся яго лёс, калі б Эміл не наведаў Беларусь. Маючы спецыяльнасць «механізацыя сельскай гаспадаркі», ён найперш і звярнуў увагу на нашу вёску.

Зямля ў Балгарыі ў прыватных руках, і там тыя гектары можна было б узяць у арэнду, але ўмовы прадастаўлення яе ў нашай краіне па некаторых пунктах аказаліся больш прывабнымі, і Енеў атрымаў у арэнду дзве адсталыя гаспадаркі ў Клецкім раёне. На іх базе было створана замежнае вытворчае сельскагаспадарчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Налібокі—Нёман».

Варта прызнаць, што, каб узяць усе праблемы былых сельгаскааператываў з даўгамі ў 1 мільярд 700 мільёнаў рублёў, трэба было мець смеласць.

